Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Трест № 26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж. Тел. +375 17 256 90 09

Предмет аукциона
Имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 254Д

Лот №	Наименование (назначение)
1	**Канализационно-насосная станция** (здание специализированное коммунального хозяйства) общей площадью 31,9 кв. м, инвентарный номер 350/С-88092

Сведения о земельном участке: общ. пл. 0,0464 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания канализационно-насосной станции

Начальная цена с НДС 20 %: 7 296,00 бел. руб.
Шаг аукциона: 364,80 бел. руб.

Имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 254

2	**Здание АБК с цехом по производству м/к** (здание многофункциональное) общей площадью 3 030 кв. м, инвентарный номер 350/С-88086. **Здание проходной** (здание неустановленного назначения) общей площадью 8,7 кв. м, инв. номер 350/С-187432. **Линия электропередачи** (сооружение специализированное энергетики) протяженностью 1 041,0 м, инвентарный номер 350/С-187432. Адрес: г. Гомель, линия электропередачи от П/С КПД по ул. Объездной до ТП-200 по ул. Барыкина, 254. **Линия электропередачи** (сооружение специализированное энергетики) протяженностью 1 159,7 м, инвентарный номер 350/С-188234. Адрес: г. Гомель, линия электропередачи от ТП-200 по ул. Барыкина, 254 до опоры № 1. **Канализационная сеть** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения) протяженностью 388,7 м, инв. номер 350/С-188231. Адрес: г. Гомель, канализационная сеть от КК1 до здания КНС по ул. Барыкина, 254. **Дождевая канализационная сеть (сооружение специализированное коммунального хозяйства)** протяженностью 473,4 м, инвентарный номер 350/С-187428. Адрес: г. Гомель, дождевая канализационная сеть на территории производственной базы по Барыкина, 254. **Водопроводная сеть (сооружение специализированное водохозяйственного назначения)** общей площадью 1 938,0 м, инвентарный номер 350/С-187430. Адрес: г. Гомель, водопроводная сеть от ВК13 до зданий по ул. Барыкина, 254. **Тепловая сеть** (сооружение специализированное энергетики). Адрес: г. Гомель, тепловая сеть от точки врезки до здания по ул. Барыкина, 254

В состав лота входит следующее имущество: телефонный кабель, аппарат факсимильный – 1 шт., компьютер с монитором – 2 шт., прибор «Алкатест» – 1 шт., принтер Herox Phaser 3140 – 1 шт., принтер HP 3140 – 1 шт., рулетка 30 м – 1 шт., травокосилка 128 R 252 71 57-58 – 1 шт., штатив ШР-160 – 1 шт., эл. обогреватель маслянный – 1 шт., эл. шкаф силовой – 1 шт., бетоносмеситель СБР-260, инв. номер 42, кран-балка, инв. номер 622, эл. кран-балка подвесная, инв. номер 706, а также многолетние насаждения, в составе: ель – 1 шт., плодовая яблоня – 9 шт., ива – 3 шт., тополь – 3 шт., тополь американский – 1 шт., клен – 3 шт., рябина – 3 шт., береза – 1 шт.

Сведения о земельном участке: общ. пл. 0,5909 га предоставлен продавцу на праве аренды по 20.06.2024 г. для эксплуатации и обслуживания АБК с цехом по производству м/к, проходной

Начальная цена с НДС 20 %: 168 742,60 бел. руб.
Шаг аукциона: 8437,13 бел. руб.

Имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 254В

3	**Открытый склад металла № 1** (сооружение специализированное складов, хранилищ) общей площадью 10 146,7 кв. м, инвентарный номер 350/С-187388. **Здание теплопункта** (здание специализированное энергетики) общей площадью 42,9 кв. м, инвентарный номер 350/С-88096

В состав лота входит иное имущество. Подробная информация на сайте организатора WWW.CPO.BY

Сведения о земельном участке: общ. пл. 1,6690 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания открытого склада металла № 1, здания теплопункта

Начальная цена с НДС 20 %: 77 100,61 бел. руб.
Шаг аукциона: 3855,03 бел. руб.

Порядок ознакомления: Каминский Павел Иванович, ликвидатор, тел. 8029-659-14-39, Дриневский Виктор Васильевич, начальник производственного участка, тел. +375 (29) 603 49 02

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Срок оплаты: при цене продажи предмета аукциона в сумме до 49 999,99 BYN – срок оплаты не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи. При цене продажи предмета аукциона в сумме свыше 50 000,00 BYN – срок оплаты не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона по лотам №№ 1–2 опубликовано в газете «Звязда» от 04.01.2020 г., по лоту № 3 в газете «Звязда» от 11.12.2019 г.

Дата, место и время проведения аукциона	**11.02.2020** в 11.30 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата, место и время окончания приема документов	**07.02.2020** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».**
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ» – управляющая компания холдинга»

Лот № 1, состав: 1. Сооружение специализированное складов, хранилищ, инв. № 500/С-30309, 286,4 кв. м. 2. Сооружение специализированное складов, хранилищ, инв. № 500/С-28809, 481 кв. м. 3.Сооружение специализированное складов, хранилищ, инв. № 500/С-30308, 85 кв. м. 4. Здание специализированное иного назначения, инв. № 500/С-26575, 1040,3 кв. м. 5. Здание специализированное иного назначения, инв. № 500/С-28807, 1819,3 кв. м. 6. Склад ГСМ, инв. № 500/С-30757, 47,2 кв. м. 7. Ливневая канализационная сеть, инв. № 500/С-1026033, 724,3 кв. м. 8. Газопровод среднего давления, инв. № 500/С-1026034, 32,2 кв. м. 9. Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть, инв. № 500/С-1026035, 459,9 кв. м. 10. Хозяйственно-бытовая канализационная сеть, инв. № 500/С-1026036, 395,1 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Гурского, 34/4, 34/2, 34/1, 34/ 3, 34, 34/5, 34 (КлК-1-КлК-23), 34 (здание – т.А), 34 (ВпК-1-ВпК-7), 34 (КбК-1-КбК-21). 11. Оборудование и механизмы (полный перечень приведен на сайте Организатора аукциона ino.by). Обременения: аренда объектов недвижимости (полный перечень приведен на сайте Организатора аукциона ino.by). Земельный участок: кадастровый номер 500000000005008075, площадь – 2,1485 га. Право аренды (по 31.05.2038). Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. **Начальная цена с НДС – 3 070 689,24 бел. руб.** Задаток – 307 068,92 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %

Условия: 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения открытого аукциона по продаже Лота № 1. 2. Условия оплаты, приобретенного на аукционе Лота № 1 согласовываются сторонами при подписании договора купли-продажи. 3. Оплатить Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,5 % от цены продажи Лота № 1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня проведения открытого аукциона по продаже Лота № 1. 4. В случае если ни один из участников аукциона не предложит свою цену за Лот № 1 в результате чего аукцион будет признан нерезультативным, эти участники аукциона уплачивают Продавцу штраф в размере 50 000,00 (пятьдесят тысяч белорусских рублей 00 копеек) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. 5. В случае если Победитель аукциона (Претендент на покупку) отказался от подписания протокола о результатах аукциона, не оплатил Организатору аукциона вознаграждение, не подписал с Продавцом договор купли-продажи в установленный срок, Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Продавцу штраф в размере 50 000,00 (пятьдесят тысяч белорусских рублей 00 копеек) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона (об аннулировании результатов аукциона)

Аукцион состоится 25.02.2020 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by. **Продавец:** ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ» – управляющая компания холдинга», 220030, г. Минск, ул. Советская, д. 4, тел. 8 (017) 200-71-17. **Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. **Получатель** – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 25.02.2020. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 21.02.2020 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Белоголов Василий Петрович, тел. 8 (029) 674-02-04

☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

Свидетельство общества с ограниченной ответственностью «СмоукАльянс» (УНП 192792206) считать недействительным в связи с утерей.

Свидетельство общества с ограниченной ответственностью «Аирган Поставка» (УНП 192286215) считать недействительной в связи с утерей.

ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует

В извещение о проведении электронных торгов по продаже имущества МОАО «Красный металлист», опубликованном в газете «Звязда» от 23.01.2020 (оборудование, бывшее в употреблении, 17 лотов), вносится изменение: заявки на участие в электронных торгах принимаются по 03.02.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by.**

Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06
E-mail: auction@cpo.by УНП 700010525

К@нтыненты

КІДОК КОБРЫ

Чым пагражае смяротны каронавірус з Кітая?

А ПОШНІМ часам увесь свет з трывогай даведваецца пра навіны з Кітая. Вядома ж, гаворка ідзе пра ўспышку смяротна небяспечнага захворвання. Як паведаміў ТАСС, да 24 студзеня ад пнеўманіі, выкліканай каронавірусам новага тыпу 2019-nCoV, памерла 26 чалавек. Колькасць тых, хто захварэў у Кітаі, перавысіла 900: большасць — у правінцыі Хубэй, а таксама ў Пекіне, паўднёвай правінцыі Гуандун, Шанхаі, Ганконгу, на Тайвані. Зарэгістраваныя выпадкі захворвання і ў іншых краінах — Тайландзе, Японіі, Паўднёвай Карэі, ЗША, Сінгапуры, В'етнаме. Паведамляецца, што ўсе пацыенты да гэтага наведвалі горад Ухань — ачаг распаўсюджвання смяротнага віруса новага тыпу. Адкуль узяўся 2019-nCoV і чым ён пагражае свету?

УХАНЬСКІ СІНДРОМ

31 снежня ўлады кітайскага горада Ухань (адміністрацыйны цэнтр правінцыі Хубэй) паведамілі пра распаўсюджванне невядомага віду пнеўманіі. На той момант было зарэгістравана 27 выпадкаў захворвання. Большасць з іх звязаны з гарадскім рынкам морапрадуктаў, які цяпер закрыты. Як стала вядома на гэтым тыдні, у кантакце з хворымі знаходзіліся больш за 2,2 тысячы чалавек.

Ухань займае 42-е месца ў спісе найбуйнейшых гарадоў свету і сёмае ў Кітаі. Тут налічваецца, паводле звестак мясцовых улад, 11 мільёнаў жыхароў. Памеры горада і яго развітая эканоміка тлумачаць, чаму вірус так хутка распаўсюдзіўся на іншыя краіны Азіі і нават дасягнуў ЗША. Паводле адкрытых статыстычных даных, у 2016 годзе Цяньхэ (міжнародны аэрапорт Ухані) абслужыў больш за 20 мільёнаў пасажыраў. З тых часоў пасажырапаток павялічыўся. З Ухані ходзяць прамыя авіярэйсы ў Лондан, Парыж, Дубай і многія іншыя гарады па ўсім свеце. Горад стаіць на беразе ракі Яньцзы. Мегаполіс вядомы сваёй высокатэхнічнай і традыцыйнай прамысловасцю. Ва Ухані шмат індустрыяльных зон і 52 вышэйшыя навучальныя ўстановы, у якіх займаецца больш за 700 тысяч студэнтаў. У мясцовую прамысловасць інвеставалі 230 з 500 найбуйнейшых кампаній свету з спісу Fortune Global.

У сераду кітайскія ўлады прынялі рашэнне закрыць гэты горад на каранцін. Тут створана штаб-кватэра па барацьбе з пнеўманіяй новага тыпу, працуюць восем груп экстраннага рэагавання, арганізаваны дзевяць спецыяльных шпіталяў для хворых, з'явілася медыцынская экспертная група. Закрытыя гарадскія рынкі, заапарк, узмоцнены кантроль над жывёламі і птушкамі, уведзены кантроль над пасажырапатокам і забарона на выезд арганізаваных груп турыстаў у іншыя рэгіёны.

ГЛАБАЛЬНЫ КАРАНЦІН

Кітайскія ўлады ўсімі сіламі імкнуцца стрымаць распаўсюджванне небяспечнага віруса. Сама меней дзевяць гарадоў кітайскай правінцыі Хубэй следам за Уханем апублікавалі паведамленні аб часовым прыпыненні транспартных зносін. Такім чынам, колькасць населеных пунктаў, дзе ў той ці іншай ступені не ходзіць транспарт, дасягнула дзесяці: Ухань (11 мільёнаў жыхароў), Чыбі (534 тысячы), Эчжоу (1,08 мільёна), Хуанган (7,5 мільёна), Сяньтаа (1,6 мільёна), Чжыцзян (550 тысяч), Цяньцзян (963 тысячы), Хуаншы (2,7 мільёна), Эньшы (809 тысяч) і Сяньнін (2,5 мільёна). Меры закранулі каля 30 мільёнаў жыхароў правінцыі.

Эксперты, аднак, выказваюць сумненні ў эфектыўнасці каранціну ў сучасным свеце. «Закрыццё горада з 11-мільённым насельніцтвам — гэта нешта экстраардынарнае», — заўважыў прадстаўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) Гаўдэн Галеа. Адгарадзіць ад знешняга свету цэлы горад, сорак другі па памеры ў свеце, будзе складана. «Адзіны спосаб гэтага дамагчыся, калі быць рэалістам, — гэта ўвесці войска, каб яно ўзяло горад у кольца, — заўважыў «Бі-бі-сі» эксперт па ахове здароўя з Сіднейскага ўніверсітэта Адам Камрад-Скот. — Але нават калі пайсці на гэта, дзе пройдзе рыса? Як і большасць сучасных гарадоў, на ўскраінах Ухань пераходзіць у драбнейшыя населеныя пункты і вёскі». Эксперт Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Гаўдэн Галеа больш адназначны. «Наколькі я ведаю, спроба стрымаць вірус у горадзе з насельніцтвам 11 мільёнаў чалавек — гэта нешта да гэтага часу невядомае навуцы. Мы не можам сказаць, ці спрацуе гэта», — сказаў ён у гутарцы з Associated Press.

БЕЗ НОВАГА ГОДА

Улады таксама прынялі рашэнне адмяніць усе маштабныя мерапрыемствы ў Пекіне, прымеркаваныя да святкавання Новага года па месячным календары 25 студзеня, — навагоднія масавыя гулянні, у тым ліку традыцыйныя кірмашы ў храмах. Мільёны людзей падчас святкавання Новага года падарожнічаюць па Кітаі. Тысячы кітайцаў таксама выязджаюць за мяжу. Акрамя таго, з 25 студзеня закрыты ўваход у Забаронены горад — палацавы комплекс Гугун, што ў цэнтры Пекіна, побач з плошчай Цяньаньмэнь.

Улады Макаа, як паведамляе ТАСС, закрываюць усе ігральныя ўстановы, апасаючыся далейшага распаўсюджвання небяспечнай хваробы. Мясцовых жыхароў заклікаюць па магчымасці больш часу праводзіць дома і пазбягаць людных месцаў. 23 студзеня ў горадзе быў выяўлены другі выпадак захворвання на каронавірус — 66-гадовы мужчына нядаўна пабываў ва Ухані. Ён і чацвёра членаў яго сям'і былі змешчаныя на каранцін.

Напярэдадні падобныя сімптомы былі адзначаны і ў 52-гадовай жанчыны, якая прыехала з таго ж горада і актыўна наведвала казіно ў Макаа. Пасля гэтага персанал усіх ігральных устаноў абавязалі насіць на рабочым месцы рэспіратарныя маскі. У суседнім Ганконгу таксама ў сувязі з эпідэміяй адменены міжнародны навагодні карнавал — на тэрыторыі адзначаны два выпадкі захворвання на вірусную пнеўманію. На набярэжнай заліва планавалі выступіць як мясцовыя калектывы, так і артысты з мацерыковага Кітая, Італіі, Японіі, Расіі, ЗША і іншых краін.

Акрамя таго, паведамляецца, што супрацоўнікі фабрык па вытворчасці медыцынскіх масак у Кітаі вымушаны ў тэрміновым парадку выходзіць на работу, нягледзячы на святочныя дні з нагоды Новага года. Кіраўнікі кітайскіх заводаў тэрмінова выклікалі супрацоўнікаў, каб справіцца з узрослым попытам на маскі з-за распаўсюджвання ў краіне небяспечнага каронавіруса. Пазбаўленым свят работнікам паабяцалі выплаціць павышаныя ў чатыры разы зарплаты. Па паведамленнях шэрагу заходніх СМІ, маскі раскупляюцца ў Кітаі вельмі хутка, выстройваюцца доўгія чэргі з тых, хто жадае набыць медыцынскія вырабы.

ЗМЯІНАЯ КРЫНІЦА

Да 9 студзеня кітайскія эпідэміёлагі вызначылі, што ўзбуджальнікам успышкі пнеўманіі ў горадзе Ухань стаў новы від каронавіруса (2019-nCoV). У выніку лабараторных даследаванняў удалося вызначыць увесь яго геном. Паводле звестак камітэта па пытаннях гігіены і аховы здароўя горада Ухань, ключавыя сімптомы захворвання — высокая тэмпература і кашаль. Большасць хворых — мужчыны.

Рызыка ўскладненняў асабліва высокая для пажылых людзей, узрост памерлых — ад 48 да 89 гадоў.

Даследаванне новага каронавіруса паказала, што гэта гібрыд двух каронавірусаў, які з'явіўся каля двух гадоў таму. Адзін з іх раней знаходзілі ў кажаноў. Мяркуецца, што ад іх заразіліся змеі, у выніку і з'явіўся гібрыдны каронавірус, які пазней трапіў у чалавечы арганізм. Пра гэта гаворыцца ў даследаванні, апублікаваным у Medical Journal of Virusology. Кітайскія навукоўцы заявілі пра гэта, калі рэканструявалі фізічную структуру віруса. Яны растлумачылі, што выявілі генетычнае падабенства аднаго з бялкоў, якія ўваходзяць у склад віруса, з двума відамі змей — паўднёвакітайскім шматпалосым крайтам і кітайскай кобрай.

Спачатку не было ясна, ці перадаецца новы вірус ад чалавека да чалавека. Да 20 студзеня высветлілася, што ўсё-ткі перадаецца. Дзяржаўны камітэт па пытаннях гігіены і аховы здароўя КНР паведаміў, што заразіліся як мінімум 14 медыцынскіх работнікаў, якія аказвалі дапамогу інфікаваным. Эксперты адзначаюць, што галоўная небяспека новага каронавіруса ў тым, што ён «выклікае смяротнае для чалавека захворванне» і, хутчэй за ўсё, можа перадавацца ад чалавека да чалавека паветранакропельным і кантактным шляхамі, выклікаючы ўспышкі захворвання ў замкнутых прасторах.

Якога-небудзь спецыфічнага лячэння новай пнеўманіі няма, адзначылі ў СААЗ. Прымяняюцца супрацьвірусныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца пры іншых вірусных захворваннях. 23 студзеня кітайскія спецыялісты працягваюць спрабаваць новыя метады пры лячэнні хворых. Медыкі паведамілі, што 53-гадовага цяжкахворага пацыента ўдалося вылечыць дзякуючы экстракарпаральнай аксігенацыі (насычэнні крыві кіслародам). СААЗ чакае далейшага распаўсюджвання захворвання ў Кітаі і, магчыма, у іншых краінах.

Эксперт РАН Сяргей Няцёсаў адзначыў ТАСС, што распаўсюджванне каронавіруса можна спыніць на працягу паўгода, калі хутка распрацаваць і арганізаваць прымяненне сродкаў дыягностыкі, а таксама інфармаваць грамадзян аб хваробе. Ганконскі вірусолаг Гуань І выказаў здагадку, што маштабы эпідэміі могуць перасягнуць маштабы «атыповай пнеўманіі» ў 10 разоў. СААЗ заклікала краіны весці пільны эпідэміялагічны маніторынг у сувязі з успышкай новай пнеўманіі.

ЗАРАЗА З РЫНКУ

Крыніцай новага віруса, як лічаць улады, стаў рынак ва Ухані. Паведамляецца, што там гандлявалі морапрадуктамі, перапрацаваным мясам птушак, а таксама аслоў, авечак, свіней, вярблюдаў, ліс, барсукоў, бамбукавых пацукоў і рэптылій. «Нам ужо вядома, што хвароба прыйшла з рынку, на якім ішоў незаконны гандаль дзікімі жывёламі», — паведамляў напярэдадні дырэктар Цэнтра па кантролі і прафілактыцы хвароб Гаа Фу. Змеі часта палююць на кажаноў у дзікай прыродзе. Мяса крайта і кобры прадавалася на Уханьскім рынку, а гэта павышае імавернасць таго, што новы вірус мог перайсці ад кажана да змяі, а затым да чалавека.

Аўтар кнігі «Зараза» Дэвід Куамен у каментары «Бі-бі-сі» расказаў, што з'яўленне каронавіруса з Кітая не магло быць нечаканасцю для ўрачоў. «Адна з самых дзіўных рыс гэтай апошняй успышкі [захворвання. — **Аўт.**] — тое, наколькі яна была прадказальная, — заявіў пісьменнік у гутарцы з вядучым праграмы на чацвёртым канале радыё «Бі-бі-сі». — Я не хачу сказаць, што мог бы прадказаць яе сам: я не навуковец і не чыноўнік сферы аховы здароўя. Але калі я вывучаў прадмет для маёй кнігі «Зараза», то гаварыў з экспертамі».

«Я пытаўся ў іх, як будзе выглядаць наступная буйная ўспышка. І яны казалі наступнае: імаверна, «гэта будзе які-небудзь від адналанцужковага РНК-віруса, напрыклад каронавірус. Ён прыйдзе ад жывёл і будзе перадавацца паветранакропельным шляхам. Магчыма, ачаг успышкі будзе на кітайскім рынку жывых жывёл», — сказаў Куамен. Ён лічыць, што кітайскія рынкі, дзе прадаюць жывых жывёл — ад курэй да кажаноў, — гэта сапраўдныя інкубатары новых вірусаў. Тым не менш пакуль не зусім зразумела, наколькі сур'ёзную небяспеку тоіць у сабе новая ўспышка, кажа Куамен. «Мы яшчэ не ведаем — вучэбная гэта трывога або сапраўдны пажар. Калі акажацца, што небяспекі для ўсяго свету няма, то ў любым выпадку гэтая наша рэпетыцыя не пройдзе дарэмна», — лічыць пісьменнік.

Між тым Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендавала ўсім краінам быць гатовымі да стрымлівання смяротнага каронавіруса. «Далейшы міжнародны вываз выпадкаў захворвання можа распаўсюдзіцца на любую краіну», — адзначаецца ў паведамленні СААЗ.

Захар БУРАК.

ХРАМ З АЎКЦЫЁНА

КАСЦЁЛ І СВЕЧКІ

Раман Міхайлавіч пераехаў ва Узду з Фаніпаля восем гадоў таму і пачаў тут ладзіць бізнес па вырабе свечак. Першым будынкам, у які прадпрымальнік удыхнуў жыццё, стала былая школа, пабудаваная яшчэ ў 1939 годзе.

— Гэты будынак нам аддалі бясплатна пад інвестыцыйны праект, наўзамен я павінен быў стварыць рабочыя месцы, расказаць мясцовым уладам пра аб'ём вытворчасці, на які мы плануем выйсці, — кажа Раман Каралёў. — Усё склалася, і праз два гады былая школа перайшла ў нашу ўласнасць, мы размясцілі тут вытворчасць, а некаторыя памяшканні ўжо здаём у арэнду.

Бізнесмен лічыць, што ў Беларусі створаны спрыяльныя ўмовы для бізнесу, калі гаворка ідзе пра пошук свабодных плошчаў для размяшчэння вытворчасці. На яго думку, у нашай краіне шмат будынкаў, якія пустуюць і якія можна неяк выкарыстоўваць.

— Калі ў прадпрымальніка ёсць жаданне, то можна знайсці памяшканне, гэта няцяжка і нядорага. Канкрэтна ў Уздзенскім раёне ёсць як плюсы, так і мінусы. У горадзе можна знайсці свабодныя плошчы і мясцовая ўлада больш клапоціцца аб развіцці прадпрымальніцтва, — лічыць Раман Міхайлавіч. — Калі параўноўваць з Фаніпалем ці Дзяржынскам, то там даўно ўсё занятае, а мясцовай уладзе не заўсёды хапае часу на рашэнне праблем — там бізнесу зашмат. Але пэўны мінус ёсць і ва Уздзе — адсутнасць чыгункі адштурхоўвае буйных вытворцаў.

Калі будынак школы прадпрымальнік атрымаў ва ўласнасць бясплатна, то касцёл ён набыў праз электронны аўкцыён. Храм быў пабудаваны ў 1798 годзе, за савецкім часам не дзейнічаў. На працягу пэўнага часу там быў размешчаны раённы палац культуры, але потым касцёл проста стаў пуставаць і паволі развальвацца. У 2013-м мясцовыя прадпрымальнікі за свае грошы аднавілі браму, Раман са сваімі супрацоўнікамі таксама не змог прайсці міма і аднавіў у будынку дах.

— Тады я яшчэ не збіраўся набываць касцёл, але дах быў не ў самым лепшым стане, — гэта згубна для драўлянага будынка. Ужо прайшло два месяцы, як я яго купіў, але навошта я гэта зрабіў, дакладна не ведаю — мабыць, не мог больш пазіраць на гістарычны будынак, які нікому не патрэбен, — дзеліцца прадпрымальнік. — Па-першае, я хачу аднавіць сам касцёл, плот, але што там будзе канкрэтна, пакуль не ведаю. Туды дакладна з'едзе частка нашай вытворчасці, бо мы пастаянна пашыраемся. На мой погляд, гэта будзе вельмі гарманічна — выраб свечак у касцёле. Зрабіць усё для гэтага будзе не так цяжка — стан былой школы быў значна горшы. Касцёл не будзе зачынены, нават цяпер мы ладзім для школьнікаў экскурсіі на нашу вытворчасць.

ПРА БІЗНЕС

Знайсці памяшканне для вытворчасці — гэта толькі палова справы, галоўнае — умець ладзіць бізнес, што ў беларускіх умовах не заўсёды проста. Да вырабу свечак Раман Каралёў займаўся і гандлем, і рэстараннай справай, і нават вырабам тратуарнай пліткі. Рабіў ён гэта і ў Мінску, і ў Дзяржынску, і ва Уздзе, але найбольшага поспеху яму ўдалося дасягнуць менавіта ў вытворчасці свечак.

Цяпер на прадпрыемстве працуе 25 чалавек, але колькасць супрацоўнікаў пастаянна расце ў сувязі з пашырэннем вытворчасці. Працэс стварэння свечак вельмі просты — іх робяць з парафіну, які выкарыстоўваецца і ў харчовай прамысловасці. Пасля таго як парафін растопяць, у яго дадаюць араматызатар і фарбавальнікі, а потым заліваюць у патрэбную форму. Астатняе ўжо залежыць ад заказчыка — роспісам свечак займаецца мастак, на гатовай прадукцыі таксама друкуюць малюнкі, подпісы і робяць дэкор. У Беларусі Раман набывае толькі парафін, усё астатняе — у Расіі, Кітаі, Інданезіі і Германіі.

— Калі мы вырашылі займацца вытворчасцю свечак, у Беларусі выраблялі толькі гаспадарчыя, і нам з жонкай захацелася паказаць людзям нешта новае, чаго няма на нашым рынку, — кажа Раман Міхайлавіч. — Ладзіць бізнес вырашылі ва Уздзе: нам падабаюцца горад і прырода, няма шуму ад чыгункі, дый умовы для развіцця бізнесу тут больш спрыяльныя, мясцовыя ўлады хутчэй рэагуюць на розныя праблемы.

Паказаць беларусам нешта новае на рынку не зусім удалося. Аказалася, што прадаваць дэкаратыўныя свечкі на радзіме не так проста — нашы гандлёвыя сеткі прапаноўваюць не самыя прымальныя ўмовы для вытворцаў. Таму наш герой пачаў шукаць рынкі, дзе тыя ўмовы былі б больш роўныя — як для вытворцы, так і для прадаўца. Ужо сёння прадпрыемства 96 % сваёй прадукцыі адпраўляе на экспарт у ЗША, Англію, Ірландыю, Іспанію і Грэцыю.

— Нашы свечкі раз'язджаюцца па ўсім свеце, і ў гэтым няма цяжкасці — бізнес размаўляе на адной мове, мы разумеем адно аднаго. Ужо цяпер разглядаем рынкі Чэхіі, Фінляндыі і нават Кітая, шмат замежных краін цікавіцца нашым прадуктам, — кажа Раман Каралёў. — Калі ты робіш яго якасна і па спрыяльнай цане, то ўвесь свет для цябе адкрыты. Кажуць, што той жа Кітай сваімі таварамі апанаваў увесь свет, але, як бачыце, гэта не так, можна працаваць і ў іх, калі ёсць жаданне, калі прапаноўваць належныя ўмовы. І ўмовы там дыктуе рынак.

На сёння самы складаны рынак для прадпрымальніка — айчынны. І цяжкасць заключаецца ў нявыгадных умовах для вытворцаў, якія дыктуе гандаль. Менавіта таму многія прадпрымальнікі шукаюць выхады на заходнія рынкі. Напрыклад, калі беларуская гандлёвая сетка набывае нейкую прадукцыю ў той жа Еўропе, то вытворца атрымлівае перадаплату і робіць дастаўку на адзін склад. З беларускімі вытворцамі мясцовыя сеткі працуюць інакш — плацяць ім грошы за прадукцыю толькі пасля яе рэалізацыі. І тут ужо залежыць ад прадаўца: хтосьці вяртае грошы вытворцу праз два месяцы пасля рэалізацыі яго прадукцыі, хтосьці — праз тры.

— Атрымліваецца, што мы спансіруем развіццё гандлёвых сетак, але і гэта не ўсё. Мы павінны рабіць дастаўку ў кожны магазін сеткі, а не на адзін склад, як гэта робяць еўрапейцы. Уявіце, калі ў сетцы каля 400 крам па краіне! Часамі даходзіць да смешнага — крадзеж, які адбываецца ў іх крамах, таксама могуць спісаць на нас: калі мы робім пастаўку на 1000 рублёў, то 3 % мы павінны кампенсаваць сеткам за крадзеж у іх жа крамах. І такіх умоў у дагаворах вельмі шмат, мы такое не падпісваем, для нас гэта значыць працаваць на страту і ў будучыні проста спустошыць сябе, — дзеліцца Раман Міхайлавіч. — Узаемаадносіны камерцыйных структур заканадаўствам не рэгулююцца, гэта падыход саміх сетак, але няправільна, калі яны хочуць вырашыць усе свае праблемы за кошт вытворцаў.

* * *

Крыўдна, што плёну працы гэтага чалавека і яго прадпрыемства фактычна не бачаць суайчыннікі. Затое яны бачаць іншае — нераўнадушнае стаўленне да месца, у якім робіцца бізнес, да людзей, што жывуць побач. А гэта дарагога каштуе.

Валерыя КІСЛАЯ, фота аўтара.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)